Основным содержанием журнала были программные статьи руководителей Красного Креста, резолюции и постановления пленумов и собраний, хроника, а также сведения о работе региональных ячеек Красного Креста. Особенностью подобных материалов стала широкое использование фотографий, иллюстрирующих личный состав и непосредственную деятельность общества, что особенно ценно для историков (рис. 3). Также в журнале публиковались рисунки, карты и даже реклама, касающаяся в основном популяризации деятельности самого Красного Креста.




**Рис. 4. Реклама строительства санитарного самолёта Красного Креста, 1928 г.**

Содержание типового номера «Бюлетэня» имело 4–6 разделов и включало в себя 2–4 редакторских или «программных» статьи, за которыми подавался блок новостей (отчётов) местных отделов Красного Креста, а завершался номер официальной хроникой (постановлениями Центрального комитета Красного Креста) и международными новостями, которые обычно включали в себя 2–3 заметки с кратким описанием деятельности обществ Красного Креста других стран. Печатались полезные для изучения истории становления Красного Креста на территории Беларуси материалы пропагандистского характера, например статья главы общества М. Барсукова о перспективах и целях развития санитарной авиации на территории Беларуси (рис. 4).

Несмотря на устойчивое финансовое положение Красного Креста, в конце 1920-х гг. в БССР был взят курс на сокращение ведомственных изданий в наркоматах и организациях [4, с. 91]. В 1929 г. «Бюлетэнь Цэнтральнага камітэту Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу» закончил своё издание, как и второй важнейший медицинский журнал БССР – печатный орган Народного комиссариата здравоохранения «Беларуская мэдычная думка». О принципиальности принятых решений свидетельствует отклонённые партийным руководством ходатайства главы Белорусского Красного Креста и по совместительству комиссара здравоохранения БССР М. Барсукова о продолжении изданий [5, л. 102–104].

Подводя итоги вышеизложенного, следует отметить, что несмотря на краткость издания периодических органов Красного Креста, они являются уникальным источником по истории становления общества. Сегодня журнал «Бюлетэнь Цэнтральнага камітэту Беларускага таварыства Чырвонага Крыжу» является библиографической редкостью: первый и второй номера за 1926 гг. были выявлены в собрании Центральной научной библиотеки НАН Беларуси, остальные – в Национальной библиотеке Беларуси.


1. Вялікае сьвята // Бюлетэнь Цэнтральнага Камітэту Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжу. – 1928. – № 8. – С. 3.
2. Государственный архив Минской области. – Ф. Р9. Оп. 1. Д. 9.
3. Капліеў, А. Медыцынскі перыядычны друк на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XX стагоддзя / А. Капліеў // Беларуская думка. – 2020. – № 9. – С. 66–74.
4. Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага камітэту на XI з'ездзе КП (б)Б. – Менск : выданьне ЦК КП (б)Б, 1927. – 161 с.
5. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 4606.
6. НАРБ. – Ф. 7. Оп. 1. Д. 398.
7. Отчет о деятельности Белорусского общества Красного Креста 1921–1927 г. г. – Минск : Издание ЦК О-ва Красного Креста, 1928. – 29 с.
8. Цьвікевіч, А. Аб патрэбе выданьня "Бюлетэня" / А. Цьвікевіч // Бюлетэнь Цэнтральнага Камітэту Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжу. – 1926. – № 1. – С. 3–6.
9. Цьвікевіч, А. Праца Цэнтральнага Камітэту / А. Цьвікевіч // Бюлетэнь Цэнтральнага Камітэту Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжу. – 1926. – № 2–3. – С. 5–10.


**Бараноўскі А. В.**

## «В БУРЕ»: ЧАСОПІС СЕННЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА ВЫКАНКАМА

У 1918–1919 гадах старшынёй Сенненскага павятовага выканкама быў Дзмітрый Прышчэпаў, у будучым наркам земляробства БССР. Падчас працы на Сенненшчыне ён праявіў сябе выдатным арганізатарам. Па яго ініцыятыве была адкрыта Беліцкая сельскагаспадарчая школа, а ў Сянно арганізаваны дзіцячы кінатэатр, духавы аркестр, тэатр імя Карла Маркса, з'явілася павятовая газета «Факел» [1]. Разам з мясцовымі пісьменнікамі А. Оршыным і М. Горным (сапр. М. Іванькові ч) Д. Прышчэпаў выдаваў часопіс «В буре».



Репозиторий ВГУ

Доўгія гады часопіс быў недаступны для беларускіх даследчыкаў, а айчынная гістарыяграфія мела толькі сціслыя звесткамі аб ім. Так, у 1994 годзе ў другім томе шасцітомнай энцыклапедыі гісторыі Беларусі быў змешчаны невялічкі артыкул пра часопіс аўтарства кандыдата філалагічных навук, даследчыка мясцовага друку Беларусі, ураджэнца Сенненскага раёна П. Дарашчонка [5].



СОДЕРЖАНИЕ:

«В буре». Стихотворение в прозе. *Льва Трубчевского.*
«На щите». Стихотворение *П. Ардатова.*
«Пролетариату». Стихотворение. *М. Горного.*
«В одиночке». Стихотворение. *П. Ардатова.*
«Дезертир». Стихотворение *Ивана Резкого.*
«Звериный образ». Рапсодия. *Андрея Оршина.*
«Мать». Стихотворение. *М. Горного.*
«Пожары». Статья. *Дмитрия Прищепова.*
«Деревня и земельная политика». Статья. *Вулканова.*
«Кооперация и социализм». Статья *Кооператора.*
.«Сельское хозяйство». Статья *А. О.*
«Что делать школе летом». Письмо школьным товарищам.
«Зеленая крокодила». Критический очерк. *Овидия.*
«Своеобразный юмор» Критический набросок. *М. Базарова.*
Ответы авторам.
Об'явления.

**Змест № 1**



СОДЕРЖАНИЕ:

«Рождение дня». Стихотворение в прозе. *Льва Трубчевского.*
«Гроза». Стихотворение. *П. Ардатова.*
«Старый храм». Стихотворение. *Ивана Резкого.*
«Тайны леса». Стихотворение. *Ивана Грибова.*
«Звериный образ» Рапсодия. *А. Оршина.*
«Деревня и земельная политика». Статья. *Вулканова.*
«Через гражданскую войну к диктатуре пролетариата» Статья. *Д. Прищепова.*
«О строительстве кооперативных организаций» Статья. *Кооператора.*
«Краткий обзор Сенненского уезда в агрономическом отношении». Статья. *Агронома Т.*
«Свирель» Критический набросок. *Овидия.*

**Змест № 2**

На працягу некалькіх год намі праводзіліся пошукі выдання ў кнігасховішчах Беларусі, але безвынікова, і гэта пры тым, што ён у свой час карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод краязнаўцаў. Напрыклад, падпісчыкам часопіса быў віцебскі гісторык А. Сапуноў [8]. Знайсці арыгіналы часопіса ў Расіі, як аказалася, не склала вялікіх высілкаў, больш за тое, у 2019 годзе ён быў алічбаваны і размешчаны на афіцыйнай старонцы электроннай бібліятэкі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург) [2]. Любы наведвальнік можа яго спампаваць бясплатна і без папярэдняй рэгістрацыі на сайце, што намі і было зроблена. Нумары выдання з фондаў РНБ захаваліся ў адносна добрым стане: у першым нумары адсутнічаюць фрагменты тэксту на 4 лістах; другі нумар прадстаўлены толькі яго першай часткай. Аднак нягледзячы на гэта, наяўныя нумары даюць поўнае ўяўленне аб часопісе.

Заснавальнікамі часопіса «В буре» з'яўляліся Сенненскі павятовы выканкам, а таксама палітычныя і грамадскія арганізацыі павета. Выданне выходзіла на рускай мове пад рэдакцыяй Дзмітрыя Прышчэпава, Андрэя Оршына, Міхаіла Горнага і было разлічана на шырокае кола чытачоў. Рэдакцыя прымала да друку вершы, артыкулы літаратурна-мастацкага зместу, а таксама артыкулы па пытаннях сельскай гаспадаркі, кааперацыі, адукацыі, аховы здароўя, рабочага і прафесійнага жыцця. Пры гэтым вершы і артыкулы павінны былі адпавядаць фармальным патрабаванням: быць разборліва напісанымі (пажадана на пішучай машынцы) на адным баку аркуша, з пакіданнем палёў для заўваг. За апублікаванне сваіх твораў на старонках часопіса аўтары атрымлівалі ганарар (за радок): верш на злобу дня – 1 руб., мастацкі верш – 1 руб. 25 кап., белетрыстыка – 75 кап., публіцыстыка – 50 кап. Пры гэтым асобны нумар часопіса каштаваў 3 руб., падпіска на месяц – 5 руб., на год – 60 руб.

Першы нумар часопіса быў надрукаваны 22 чэрвеня 1919 года ў друкарні Сенненскага саўнаргаса, другі, ён жа апошні – 25 ліпеня 1919 года. Выданне мела наступныя раздзелы: вершы, палітычны аддзел, аддзел кааперацыі, народная адукацыя, агляд друку, адказы аўтарам, аб'явы. Часопіс для сенненцаў быў своеасаблівым «рупарам». Праз яго маладыя аўтары знаёмілі грамадскасць са сваімі паэтычнымі і мастацкімі творамі, а кіраўніцтва павета прапагандавала ў масах бальшавіцкія ідэі.

Тэматыка публікацый цалкам адпавядала свайму часу, аўтары закраналі паслярэвалюцыйныя змены, падзеі грамадзянскай вайны і пасляваеннага аднаўлення. Пры гэтым мясцовая,

Рэпазіторый ВДУ

краязнаўчая тэматыка амаль адсутнічала. Пэўнае выключэнне ў гэтым плане складаў артыкул «Краткий обзор Сенненского уезда в агрономическом отношении» аўтарства Агранома Т., што быў надрукаваны ў другім нумары часопіса. На жаль, дадзены артыкул быў змешчаны ў другой часцы выдання, той самай, што адсутнічае ў РНБ, і таму мы не маем уяўлення пра яго змест.

Характэрнай асаблівасцю часопіса з'яўлялася тое, што аўтары падпісвалі свае паэтычныя творы і артыкулы псеўданімамі і крыптонімамі. Так, напрыклад рэдактар сенненскай павятовай газеты «Факел» Міхаіл Іванькoвіч выкарыстоўваў псеўданім М. Горны.

На старонках часопіса «В буре» былі апублікаваныя: вершы П. Ардатава, Міхаіла Горнага, Івана Грыбава, Івана Рэзкага; верш у прозе Льва Трубчэўскага; рапсодыя Андрэя Оршына; артыкулы Агранома Т. , Вулканава, Каапeратара, Дзмітрыя Прышчэпава; крытычны накід М. Базарава [3–4].

Матэрыялы, што змяшчаюцца ў двух нумарах выдання, маюць унікальны характар, паколькі нідзе не публікаваліся, як да гэтуль, так і пасля. Намі нават некалькі вершаў і артыкулаў былі загружаныя ў сістэму «Антыплагіят» (прызначана для праверкі тэкставых дакументаў на наяўнасць запазычанняў з адкрытых крыніц у сетцы Інтэрнэт і іншых крыніц) і мы атрымалі адмоўны вынік. Вывучэннем літаратурна-мастацкіх твораў, што былі надрукаванны ў часопісе, абавязкова павінны заняцца спецыялісты ў гэтай галіне.

Часопісу «В буре» было наканавана хутка ўзнікнуць і гэтак жа хутка знікнуць. Усяго пабачыла свет толькі два нумары выдання. У сувязі з гэтым П. Дарашчонак у сваім артыкуле адзначаў: «На жаль, многія перыферыйныя часопісы, якія масава ўзнікалі ў рэвалюцыйны час, з-за матэрыяльных і арганізацыйных цяжкасцей спынялі сваю працу пасля выхаду аднаго ці двух нумароў» [6]. Спыненне выхаду часопіса не было звязана з яго выданнем ці распаўсюджваннем, справа была ў рэдкалегіі, дакладней у Дзмітрыі Прышчэпаве. У жніўні 1919 года Народны камісарыят дзяржаўнага кантролю РСФСР абвінаваціў Д. Прышчэпава ў перавышэнні паўнамоцтваў, дапушчаных ім падчас перадачы Сенненскага павета з Магілёўскай губерні ў Віцебскую губерню, і адхіліў яго ад абавязкаў старныні Сенненскага павятовага выканкама. Напрыканцы жніўня Дзмітрый Прышчэпаў наогул быў прызваны ў Чырвоную Армію [1].

Вышэй мы ўжо згадвалі пра адсутнасць часопіса «В буре» ў кнігасховішчах Беларусі, на нашу думку, на гэта таксама паўплывала асоба Д. Прышчэпава. Згодна з загадам № 33 Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў пры Народным камісарыяце асветы БССР ад 3 чэрвеня 1937 года ўсе публікацыі Дзмітрыя Прышчэпава падлягалі канфіскацыі з бібліятэк грамадскага карыстання, навучальных устаноў і кнігагандлю [7]. На момант прыняцця дадзенага загаду Д. Прышчэпаў адбываў пакаранне па сфабрыкаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі».

Такім чынам, увядзенне ў навуковы ўжытак двух нумароў часопіса «В буре» з'яўляецца падзеяй не толькі рэгіянальнага, але і агульнадзяржаўнага маштабу, паколькі адным з яго рэдактараў быў Д. Прышчэпаў, чалавек які ў 1920-я гады прымаў актыўны ўдзел у дзяржаўным будаўніцтве Савецкай Беларусі і яе сацыяльна-эканамічным развіцці. І ўвогуле яшчэ не ўсе аўтары выдання ідэнтыфікаваныя, а таму можа яшчэ хто-небудзь з вядомых асоб хаваецца за псеўданімам ці крыптонімам. Несумненна, матэрыялы часопіса «В буре» з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння мовы рэвалюцыйнай пары, яе бытавання ў глыбінцы. Выданне часопіса сведчыць і пра тое, что ў Сянно ў 1919 годзе існаваў асяродак дзеячаў культуры, навукі і мастацтва, які здолеў наладзіць выданне часопіса. Сам факт выхаду павятовага часопіса з'яўляецца ўнікальным не толькі для Віцебшчыны, але і для Беларусі ў цэлым. Сёння раённая газета «Голас Сеннешчыны» выдаецца ў Віцебску, а сто год таму свой часопіс, як і павятовую газету «Факел», выдавалі ў Сянно.


1. Бараноўскі, А. Дзмітрый Прышчэпаў: невядомыя старонкі біяграфіі / А. Бараноўскі // Беларуская думка. – 2020. – № 6. – С. 24–32.
2. В буре [Электронны рэсурс] // Электронная бібліятэка Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. – Рэжым доступу: https://primo.nlr.ru/primo-explore/search?vid=07NLR_VU1&tab=default_tab&facet=tlevel,include,online_resources&query=any,contains,%22%D0%92%20%D0%B1%D1%83%D1%80%D0%B5%22. – Дата доступу: 03.03.2021.
3. В буре : лит.-худ., полит., экон. и культ.-просв. двухнед. журнал. – 1919. – № 1 (июнь). – 18 с.
4. В буре : лит.-худ., полит., экон. и культ.-просв. двухнед. журнал. – 1919. – № 2 (июль). – 7 с.
5. Дарашчонак, П. Л. В буре / П. Л. Дарашчонак // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 2 : Беліцк – Гімн // Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 1994. – С. 178.
6. Дарашчонак, П. Дызайн беларускіх часопісаў 20-х – пачатку 30-х гг. ХХ ст. / П. Дарашчонак // Визуально-семантические средства современной медиаиндустрии : материалы Респ. науч.-практ. конф., 20–21 марта 2015 г., Минск / редкол.: С. В. Дубовик (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2015. – С. 57.
7. Лукашук, А. 421°паводле Галоўліту / А. Лукашук // Спадчына. – 1996. – № 3. – С. 88.
8. Хмяльніцкая, Л. Бібліятэка А. П. Сапунова / Л. Хмяльніцкая // Гісторык з Віцебска: Жыццяпіс Аляксея Сапунова. – Минск : Энцыклапедыкс, 2001. – С. 229–251.




Репозиторий ВГУ